ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 28 (515) | Субота, 23 кастрычніка 1982 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

КАМУНІСТЫ! БУДЗЬЦЕ Ў АВАНГАРДЗЕ ЎСЕНАРОДНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАННЕ ГІСТАРЫЧНЫХ РАШЭННЯЎ XXVI З'ЕЗДА КПСС, ЗАДАННЯЎ ПЯЦІГОДКІ!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ — НАДЗЕЙНЫ ПАМОЧНІК І БАЯВЫ РЭЗЕРВ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ПЕРАДАВЫ АТРАД МАЛАДЫХ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

*29-га кастрычніка—Дзень нараджэння камсамола*

## БАЯВЫ РЭЗЕРВ ПАРТЫІ

29-га кастрычніка ўся камсамолія краіны адзначыць 64-ю гадавіну з дня нараджэння Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі. І напярэдадні гэтага вялікага для ўсёй моладзі свята мы, як і заўсёды перад знамянальнымі і ўрачыстымі падзеямі, падводзім вынікі здзейсненага, намячаем планы на будучае.

Галоўная задача, якая стаіць перад моладдзю, была сфармулявана У. І. Леніным на III Усерасійскім з'ездзе РКСМ 2 кастрычніка 1920 года: **«...задача састаіць у тым, каб вучыцца... вучыцца камунізму»**. Сугучны ленінскія словы з наказам Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева на XIX з'ездзе ВЛКСМ: **«...Маладосць — гэта раніца жыцця. Гэта пара, калі чалавек фарміруецца як асоба, як грамадзянін. Вось чаму моладзь павінна пастаянна вучыцца...»**.

Прамова Л. І. Брэжнева на XIX з'ездзе ВЛКСМ з'явілася для нас не толькі баявой праграмай дзейнасці, але і высокім давер'ем свайму баявому памочніку-камсамолу.

Камсамольцы ГДУ сустракаюць дзень нараджэння камсамола новымі поспехамі ў вучобе, навукова-даследчай рабоце, працы, грамадска-палітычнай дзейнасці.

Камсамольская арганізацыя універсітэта па праву ганарыцца сваімі выдатнікамі вучобы і актывістамі, сярод якіх ленінскія і імянныя стыпендыяты А. Гайдукова, Г. Байкачоў, В. Малашанка, Н. Кандратава, М. Сергіенка, Н. Федарцова, С. Рыдны, І. Афанасьеў.

Сотні нашых юнакоў і дзяўчат, факультэцкія камсамольскія арганізацыі прынялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ і па дастойнай сустрэчы 60-годдзя ўтварэння СССР. Усе вучэбныя групы прынялі ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве за права называцца лепшай ва універсітэце. Гэта садзейнічала павышэнню адказнасці за галоўны абавязак студэнта — вучобы. Сёння мы называем правафланговыя акадэмічныя групы: Г-51, 0-41, Б-32.

Студэнцкія гады — гады творчасці. Таму многія юнакі і дзяўчаты прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце, ва ўсесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Нядаўна за актыўны ўдзел у рабоце студэнцкага канструктарскага бюро універсітэта Граматамі Мінвуза БССР узнагароджаны студэнт факультэта фізвыхавання Васіль Мартынёнак і студэнт фізфака Аляксандр Чарчук.

Вучыцца і працаваць ва ўмовах міру —вялікае шчасце для людзей. «Вам, маладым, выпала шчасце вырасці і жыць ва ўмовах міру, не ведаючы бед вайны. Трэба даражыць гэтым, захаваць гэты каштоўны здабытак», — сказаў тав. Л. І. Брэжнеў на XIX з'ездзе ВЛКСМ. Камсамольская арганізацыя нашага універсітэта з'яўляецца актыўным удзельнікам «Маршу міру» савецкай моладзі. Мітынгі за раззбраенне, забарону вытворчасці «гуманнай» зброі, сабраныя тысячы подпісаў студэнтаў, выкладчыкаў ГДУ пад паштоўкай пратэсту натаўскім генералам, адкрытае пісьмо пратэсту прэзідэнту ЗША Р. Рэйгану, пасланне народам Цэнтральнай Амерыкі, якія змагаюцца за свабоду і незалежнасць, агульнауніверсітэцкі мітынг «Мір — народам», сабраныя 1.400 подпісаў пад пасланнем Генеральнаму сакратару ААН П. дэ Куэльяру, збор тысяч рублёў у Фонд міру, патрыятычная работа па прапагандзе Праграмы Міру нашай партыі студэнтамі ў час працоўнага семестра — усё гэта наш уклад у справу захавання і ўмацавананя міру на зямлі.

Арганічнай састаўной часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу стаў для студэнтаў ГДУ трэці працоўны семестр. Зводны студэнцкі атрад універсітэта колькасцю больш 1200 чалавек па-ударнаму працаваў гэтым летам у розных раёнах вобласці, у Нечарназем'і, Малдавіі, у братняй Чэхаславакіі. Сваёй самаадданай працай на будаўнічых пляцоўках, на палетках калгасаў і саўгасаў, на прадпрыемствах харчовай прамысловасці, на транспарце студэнты адказалі на рашэнне майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС аб выращэнні Харчовай праграмы. Падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж зводнымі атрадамі факультэтаў. Лепшымі названы фізічны, эканамічны і гісторыка-філалагічны факультэты.

У юбілейны для нашай Радзімы год асаблівую ўвагу камітэт камсамола ГДУ ўдзяляе інтэрнацыянальнаму выхаванню студэнцкай моладзі. Клуб інтэрнацыянальнай дружбы «Саюз» наладзіў цесныя сяброўскія сувязі з 40 Кідамі ВНУ краіны. Адбываецца абмен дэлегацыямі, праводзяцца фестывалі Кідаў у розных гарадах нашай краіны.

Адной з новых форм ваенна-патрыятычнай работы, якую вядуць студэнты ГДУ, стала напісанне камсамольцамі гістфіла летапісу народнай славы Цэнтральнага раёна. Знойдзены цікавыя матэрыялы пра героя-ў-падпольшчыкаў, аб гісторыі буйнейшых прадпрыемстваў раёна. Наперадзе новыя цікавыя пошукі і адкрыцці.

Камсамол — верны сын і баявы рэзерв партыі — самаадданай працай будзе змагацца за тое, каб у сэрцах кожнага маладога чалавека заўсёды гарэў агонь Вялікага Кастрычніка.

**С. АЎСЕЕНКА,**
**сакратар камітэта ЛКСМБ.**

## ЗА ПЕРШЫНСТВО Ў СПАБОРНІЦТВЕ

**Незвычайнае пашыранае пасяджэнне Савета універсітэта адбылося 21 кастрычніка ў кабінеце рэктара. Яно было прысвечана ўручэнню ўзнагарод за першынство ў спаборніцтве па аказанню шэфскай дапамогі саўгасу «Рэчкі» Веткаўскага раёна.**

**Выступіў першы сакратар Веткаўскага РК КПБ Л. С. Навасёлаў. Ён расказаў аб выніках бягучага сельскагаспадарчага года і адзначыў, што сумеснай пастановай бюро Веткаўскага і Цэнтральнага райкомаў партыі калектыву Гомельскага дзяржаўнага універсітэта за лепшыя вынікі па нарыхтоўцы кармоў у саўгасе «Рэчкі» прысуджаны пераходны чырвоны вымпел з уручэннем грашовай прэміі ў размеры 100 рублёў. Універсітэт узнагароджаны таксама Ганаровай граматай Веткаўскага і Цэнтральнага райкомаў партыі.**

**Узнагароды ўручылі першыя сакратары Цэнтральнага і Веткаўскага райкомаў КПБ Г. М. Кускова і Л. С. Навасёлаў.**

**Выступіў рэктар акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць. Ён выказаў упэўненасць, што калектыў універсітэта прыкладзе ўсе намаганні, каб пераходны чырвоны вымпел атрымаў у ГДУ пастаянную прапіску. Пад усеагульнае адабрэнне прысутных была сустрэта прапанова Барыса Васільевіча ўнеслі атрыманую прэмію ў Фонд міру.**

**Пры ўдзеле першых сакратароў РК КПБ Г. М. Кусковай і Л. С. Навасёлава, кіраўнікоў саўгаса «Рэчкі» у рэктараце адбылася канкрэтная дзелавая размова аб аказанні гэтай гаспадарцы больш эфектыўнай шэфскай дапамогі калектывам універсітэта.**

*З агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу*

## ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК ГРАМАДАЗНАЎЦАЎ

15-га кастрычніка ў актавай зале ГДУ адбыўся адкрыты агульнауніверсітэцкі партыйны сход.

ПЕРШЫМ на парадак дня было вынесена пытанне «Аб рабоце Цэнтральнага РК КПБ г. Гомеля за прайшоўшы перыяд пасля XXIII раённай партыйнай канферэнцыі». З інфармацыяй выступіла першы сакратар Цэнтральнага раённага камітэта партыі, член ЦК КПБ **Г. М. Кускова.** Яна падрабязна прааналізавала дасягненні працоўных калектываў раёна, якіх яны дабіліся пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый па ажыццяўленню гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда Кампартыі Беларусі, па выкананню пастановы XXIII раённай партыйнай канферэнцыі. Адзначана, што планавыя заданні і сацыялістычныя абавязацельствы па большасці важнейшых тэхніка-эканамічных паказчыкаў выконваюцца паспяхова. Увесь прырост аб'ёму вытворчасці забяспечваецца за кошт павышэння прадукцыйнасці працы.

На сённяшні дзень Цэнтральны раён у сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 60-годдзя ўтрымлівае вядучыя пазіцыі ў ардэнаносным Гомелі.

Працоўныя раёна ўносяць значны ўклад у выкананне Харчовай праграмы. Яны шэфствуюць над калгасамі і саўгасамі Веткаўскага і Лоеўскага раёнаў. Узятыя абавязацельствы паспяхова выкананы.

Гарачымі апладысментамі было сустрэта паведамленне аб тым, што сумеснай пастановай бюро Цэнтральнага і Веткаўскага РК КПБ прысуджана першае месца з уручэннем вымпела і грашовай прэміі нашаму універсітэту за лепшыя вынікі па аказанню шэфскай дапамогі саўгасу «Рэчкі».

Як вядома, калектыў ГДУ ўжо на працягу некалькіх год дапамагае вырошчваць і ўбіраць гароднінныя культуры, нарыхтоўваць кармы для грамадскай жывёлы, выконваць іншыя неадкладныя сельскагаспадарчыя работы саўгасу «Рэчкі». Сёлета на кожнага працаваўшага ад ГДУ тут нарыхтавана ў сярэднім па адной тоне сена. Гэта самы высокі паказчык, за які і прысуджана калектыву універсітэта першынство.

У зробленай Г. М. Кусковай інфармацыі адзначаліся не толькі новыя метады і прыёмы работы РК КПБ і партыйных арганізацый раёна па забеспячэнню выканання вытворчых праграм і сацыялістычных абавязацельстваў другога года і адзінаццатай пяцігодкі ў цэлым, але і ўказвалася на яшчэ маючыя месца істотныя ўпушчэнні і недахопы. Патрабуюць вырашэння пытанні ўмацавання працоўнай дысцыпліны, усеагульнай барацьбы і недапушчэння антыграмадскіх учынкаў і службовых злоўжыванняў. Для схільных да гэтага камуністаў Цэнтральны КПБ пачаў адносіцца больш патрабавальна і строга.

Г. М. Кускова выказала ўпэўненасць, што працоўныя раёна, у тым ліку і калектыў універсітэта, змагаючыся за ажыццяўленне рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, выконваючы пастанову XXIII раённай партыйнай канферэнцыі, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый забяспечаць рэалізацыю высокіх вытворчых планаў і сацыялістычных абавязацельстваў на ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва.

ЗАТЫМ партыйны сход перайшоў да абмеркавання пытання «Аб задачах кафедр грамадскіх навук, вынікаючых з рашэнняў XXVI з'езда КПСС, пастаноў партыі і ўрада». З дакладам выступіў намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце, доктар філасофскіх навук, прафесар **У. М. Калмыкоў.** У нашай краіне, зазначыў ён, удзяляецца неаслабная ўвага вышэйшай школе, якая рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры для народнай гаспадаркі, адукацыі, культуры. Важная роля ў падрыхтоўцы спецыялістаў, палітычна адданых, маральна здаровых, належыць кафедрам грамадскіх навук. На гэта нацэльваюць іх матэрыялы партыйных з'ездаў, многія агульнавядомыя пастановы партыі і ўрада.

Сур'ёзнае ўздзеянне на работу грамадазнаўцаў, зазначыў дакладчык, аказвалі Усесаюзная нарада загадчыкаў кафедр грамадскіх навук, якая адбылася ў 1981 г.,

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

## УРУЧАНА ГАНАРОВАЯ ЎЗНАГАРОДА

**Загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін прафесар Ф. М. Харытановіч знаходзіцца ў радах Ленінскай партыі з 1929 года. Ён удастоены ўстаноўленага ЦК КПСС нагруднага знака «50 гадоў знаходжання ў КПСС». Гэтая ганаровая ўзнагарода была ўручана Фёдару Мікалаевічу першым сакратаром Цэнтральнага райкома КПБ г. Гомеля Г. М. Кусковай ва ўрачыстай абстаноўцы на адкрытым агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе. Яна гаварыла пра Ф. М. Харытановіча як пра камуніста, які прайшоў выдатны жыццёвы і працоўны шлях, удастоены высокіх урадавых узнагарод — ордэнаў Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медаляў, — працягваючага навукова-педагагічную і грамадскую дзейнасць.**

**Прымаючы дарагую узнагароду, Фёдар Мікалаевіч Харытановіч горача дзякаваў за яе роднай Камуністычнай партыі, Палітбюро ЦК КПСС на чале з верным ленінцам таварышам Л. І. Брэжневым і запэўніў, што не пашкадуе сіл і ведаў, каб і ў далейшым быць карысным свайму народу роднай партыі, любімай Радзіме.**

## *ВІНШУЕМ!*

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра тэарэтычнай фізікі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры КАПШАЯ Валерыя Мікалаевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.**

# ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК ГРАМАДАЗНАЎЦАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-ай стар.).

лістападаўскі (1981 г.) і майскі (1982 г.) Пленумы ЦК КПСС, нядаўна прынятая пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні сістэмы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў». У гэтай сувязі У. М. Калмыкоў дэталёва прааналізаваў работу кафедр грамадскіх навук нашага універсітэта, зазначыў рост іх навуковага патэнцыялу і лектарскага майстэрства вядучых выкладчыкаў, спыніўся на некаторых упушчэннях і недахопах.

У дакладзе была звернута ўвага на ўдасканаленне выкладання грамадскіх навук. Пры гэтым падкрэслівалася неабходнасць пастаяннай карэкціроўкі, перапрацоўкі чытаемых курсаў, а адсюль і планаў семінарскіх заняткаў, тэматыкі рэфератаў, кантрольных, курсавых і студэнцкіх навуковых работ у святле новых дакументаў партыі і ўрада.

Грамадазнаўцы павінны кіравацца перш за ўсё патрабаваннямі пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў». Галоўная задача — больш поўна адлюстроўваць навейшыя дасягненні навукі і перадавога вопыту, каб заняткі насілі праблемны характар, закранаді актуальныя пытанні тэорыі і практыкі, сучасныя дасягненні грамадскага і навукова-тэхнічнага развіцця, садзейнічалі паглыбленай самастойнай рабоце.

У шырокім аспекце разгледжана дакладчыкам навуковая і грамадская работа грамадазнаўцаў — як аднаго з важнейшых фактараў іх прафесіянальнага ўдасканалення і росту.

— Жыццё прад'яўляе сёння асаблівыя патрабаванні да асобы выкладчыка грамадскіх навук, да яго інтэлектуальнага, ідэйна-палітычнага і маральнага аблічча, — сказаў у заключэнне У. М. Калмыкоў. Ад яго студэнты пераймаюць не толькі веды, але і пераканансць, партыйную старанасць, маральны вопыт. Партыя даверыла вузаўскім грамадазнаўцам важны ўчастак ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы, які ў многім вызначае развіццё духоўнага патэнцыялу савецкага грамадства. Наш абавязак — рыхтаваць спецыялістаў, якія добра засвояць навуку камунізму, здолеюць прымяніць яе на практыцы, будуць беззапаветна аддадзенымі вялікай справе партыі.

У АБМЕРКАВАННІ інфармацыі Цэнтральнага РК КПБ і даклада У. М. Калмыкова прынялі ўдзел намеснік старшыні Савета кафедр грамадскіх навук універсітэта дацэнт кафедры гісторыі КПСС **А. П. Мяшчэрскі**, дэкан матэматычнага факультэта, член райкома КПБ **У. Ф. Філіпцоў**, сакратар камітэта ЛКСМБ **С. У. Аўсеенка**, сакратары партыйных бюро: біялагічнага факультэта — **В. А. Хількевіч**, фізічнага факультэта — **Т. П. Жалонкіна**, дэкан факультэта грамадскіх прафесій **А. І. Канашэвіч**, сакратар партыйнага камітэта ГДУ, член РК КПБ **М. І. Старавойтаў**.

Па абмеркаваных пытаннях прыняты адпаведныя пастановы.

У рабоце партыйнага сходу прыняў удзел рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР, член абласнога камітэта партыі **Б. В. Бокуць**.

# ЛЕПШЫЯ АКАДЭМІЧНЫЯ ГРУПЫ

**На пасяджэнні камітэта камсамола універсітэта падведзены вынікі II-га этапа агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу, прысвечанага 60-годдзю ўтварэння СССР і XIX з'езду ВЛКСМ.**

**У аглядзе-конкурсе прынялі ўдзел 164 групы ГДУ. На разгляд камісіі былі прадстаўлены 14 акадэмічных груп, у якіх па выніках летняй сесіі была стопрацэнтная паспяховасць.**

**Лепшыя паказчыкі ў вучэбна-выхаваўчай, навукова-даследчай і грамадска-палітычнай дзейнасці ў груп Г-51 гісторыка-філалагічнага факультэта (стараста Р. Стрыжак, камсорг А. Анціпенка, прафорг В. Кравец), групы 0-41 эканамічнага факультэта (стараста І. Баранаў, камсорг В. Бабошка, прафорг Л. Стрыжнёва), групы Б-32 біялагічнага факультэта (стараста С. Пясоцкі, камсорг І. Мрынская, прафорг Г. Барскіх). Яны занялі адпаведна першае, другое і трэцяе месцы. Усе гэтыя групы былі прызнаны пераможцамі ў аглядах-конкурсах на факультэтах.**

**Лепшыя акадэмічныя групы універсітэта будуць узнагароджаны пераходнымі вымпеламі, граматамі камітэта камсамола і прафкома ГДУ.**

*Грамадска-палітычная атэстацыя*

# СПРАВЕ—ТВОРЧЫ ПАДЫХОД

У кастрычніку — лістападзе ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях праводзіцца грамадска-палітычная атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!». Ленінскі залік — комплексная форма работы камсамола ў сістэме камуністычнага выхавання моладзі, якая дае магчымасць камсамольцам суаднесці сваё жыццё, учынкі з ленінскай думкай, а камсамольскаму калектыву ацаніць працу, маральныя пазіцыі, грамадскую актыўнасць юнакоў і дзяўчат.

У ходзе Ленінскага заліку кожны камсамолец ставіць перад сабой адказныя задачы па асноўных напрамках дзейнасці ў навуковай і даследчай рабоце, вывучэння марксісцка-ленінскай спадчыны, імкнецца быць актыўным у грамадскім жыцці, павышаць свой культурны ўзровень, удасканальвацца фізічна.

У камсамольскіх арганізацыях універсітэта назапашаны вялікі вопыт правядзення Ленінскага заліку. Да кожнага камсамольскага бюро факультэтаў даведзены метадычныя рэкамендацыі, распрацаваныя на аснове гэтага вопыту. Цяпер перад камсамольскімі бюро стаіць задача правесці атэстацыю на высокім арганізацыйным і ідэйна-палітычным узроўні.

У некаторых акадэмічных групах універсітэта грамадска-палітычная атэстацыя ўжо адбылася. Так, на біялагічным, гісторыка-філалагічным і эканамічным факультэтах у групах Б-32, Г-21 і 0-32 атэстацыя праходзіла на належным узроўні, у жывой і творчай атмасферы.

У групе 0-32 эканомфака камсамольцы трымалі своеасаблівую справаздачу перад сваімі таварышамі па вучобе аб тым, як яны выконвалі прынятыя асабістыя комплексныя планы, камсамольскія даручэнні. Адной з форм Ленінскага заліку з'яўляецца індывідуальная гутарка з камсамольцамі. Характар такой гутаркі і насіла грамадска-палітычная атэстацыя ў групе будучых эканамістаў. Ішла размова пра вучобу, навукова-даследчую дзейнасць студэнтаў, іх вольны час, быт.

Грамадска-палітычная атэстацыя ўтрымлівае ў сабе не толькі элементы справаздачнасці перад таварышамі, калектывам, самім сабой у дасягнутым, але дапамагае маладому чалавеку вызначыць для сябе новыя задачы, новыя рубяжы для свайго ўдасканальвання. Таму кожны камсамолец павінен творча падыходзіць да складання комплекснага плана ўдзельніка Ленінскага заліку, каб асноўнымі яго элементамі былі барацьба за якасць ведаў, глыбокае вывучэнне марксісцка-ленінскай тэорыі, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, працоўным семестры і г. д. Такімі і былі комплексныя планы ў студэнтаў групы 0-32, старасты групы, дэпутата раённага Савета народных дэпутатаў В. Жосткіна, у камсорга групы Т. Федарцовай, члена камітэта камсамола універсітэта Н. Ісакавай. З іх і павінны браць прыклад тыя камсамольцы, асабістыя комплексныя планы якіх насілі не канкрэтны характар.

«Кожная група павінна мець свае адметнасці, свой «твар»,— зазначыў у сваім выступленні на атэстацыі ў групе 0-32 сакратар камітэта камсамола С. У. Аўсеенка.—Таму камсамольцам трэба шукаць новыя формы работы, каб ажывіць жыццё групы. Трэцякурснікі — «залатая сярэдзіна» — павінны знаходзіцца ў авангардзе студэнцкай моладзі на факультэце, паказваць прыклад малодшым курсам, каб яны захоўвалі і памнажалі лепшыя традыцыі факультэта, універсітэта».

Выказана таксама пажаданне актывізаваць кантакты паміж студэнтамі групы і яе куратарам.

Грамадска-палітычная атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку працягваецца ў студэнцкіх групах усіх факультэтаў.

**(Наш кар.).**

**ПРАЦАВАЦЬ ПА-ЎДАРНАМУ — НАШ ПАТРЫЯТЫЧНЫ І ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ АБАВЯЗАК!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).

# КАЛІ ПОБАЧ СЯБРЫ

**Даўнія сяброўскія сувязі завязаліся паміж студэнтамі нашага універсітэта і Сельскагаспадарчым інстытутам горада-пабраціма Чэске-Будзеёвіцэ ЧССР. У гэтым годзе свой працоўны семестр у братняй Чэхаславакіі правялі студэнты эканамічнага факультэта, на базе якога быў сфарміраваны СБА «Дружба-82» (камандзір І. К. Кекіш, камісар В. Кароткі). Атрад дыслацыраваўся ў г. Чэске-Будзеёвіцэ, абласным цэнтры Паўднёвай Чэхіі.**

Працаваў наш атрад сумесна з чэшскімі рабочымі ў вучэбнай гаспадарцы інстытута на ўзвядзенні жывёлагадоўчага комплексу. Асабліва хочацца сказаць пра тыя цёплыя адносіны, якія ўсталяваліся паміж намі і рабочымі. Мы сталі сапраўднымі сябрамі.

Нам асабліва запамятаўся злёт СБА, які праходзіў у маляўнічым мястэчку Льгеніцэ, куды прыехалі акрамя нас, будаўнічыя брыгады з ЧССР, ГДР і Балгарыі. Злёт адкрыўся спартыўнымі спаборніцтвамі, у якіх каманда нашага атрада заняла першае месца па валейболу і трэцяе па футболу. Затым ва ўрачыстай абстаноўцы ўзнагароджваліся пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва. Наш СБА «Дружба-82» — адзіны атрад з Савецкага Саюза ва ўсёй Паўднёвай Чэхіі, заваяваў у ім першае месца. Па ўсіх паказчыках пераможцам спаборніцтва ўнутры атрада стаў студэнт 3-га курса Віктар Жосткін.

У вольны час мы рабілі цікавыя экскурсіі па гораду, у старажытныя замкі, якіх так многа ў Паўднёвай Чэхіі.

Пасля заканчэння рабочага перыяду атраду прадстаяла культурная праграма па гарадах Чэхаславакіі. Вечарам апошняга рабочага дня для нас, студэнтаў ГДУ, дэканатам сельгасінстытута быў наладжан цёплы прыём, Дэкан аднаго з факультэтаў і загадчык вучэбнай гаспадаркі расказалі нам аб сельскагаспадарчым інстытуце. Шмат цікавага мы даведаліся пра вучэбную гаспадарку інстытута, дзе студэнты праходзяць практыку і якая ўяўляе сабой буйнае сельскагаспадарчае прадпрыемства і забяспечвае

# ЗАЎСЁДЫ БАЧНЫ ЁН—



харчаваннем большую частку насельніцтва Паўднёвай Чэхіі. Сакратар камітэта Саюза Сацыялістычнай Моладзі (ССМ) расказала нам аб дзейнасці гэтай арганізацыі, яе сувязях з ВЛКСМ. А мы падрабязна азнаёмілі чэшскіх сяброў з нашым Гомельскім дзяржаўным універсітэтам, справах яго камсамольскай арганізацыі.

Культурнай праграмай прадугледжвалася наведанне намі абласнога цэнтра Заходняй Чэхіі горада Пльзень. Гэта буйны прамысловы цэнтр з заводамі аб'яднання «Шкода». Тут жа выпрабляецца сусветна вядомае чэшскае піва.

Пабывалі мы ў гарадах Карлавы Вары і Высшы Брод, Хеб і Дамашліцэ, зрабілі экскурсію на адно з азёраў — любімае месца адпачынку чэхаў.

Асаблівыя ўражанні пакінула ў нас сталіца ЧССР, якую па праву называюць Злата Прага. Прага — адзін з прыгажэйшых гарадоў Еўропы, дзе гарманічна спалучаюцца архітэктурныя стылі ўсіх часоў і эпох. Рабяты азнаёміліся з архітэктурным ансамблем Пражскага Града, наведалі скарбніцу еўрапейскага мастацтва, дзе прадстаўлена вялікая калекцыя карцін фламандскіх, французскіх, рускіх, італьянскіх, нямецкіх майстроў пэндзля, агледзелі экспазіцыю музея Народнай арміі ЧССР.

Прадметам захаплення для турыстаў усіх краін з'яўляецца ўнікальны старажытны гадзіннік на вежы Пражскай ратушы на Старамесцкай плошчы. Уражваюць сваімі памерамі і формамі пабудаваны ў гатычным стылі сабор св. Віта, прыгажосцю канструкцыі Карлаў мост.

Пабывалі мы і ў Пражскім заапарку, які з'яўляецца адным з буйнейшых у Еўропе, у Нацыянальным музеі з яго ўнікальнымі калекцыямі мінералаў і старажытных манет, палеантала-гічнай і заалагічнай экспазіцыямі, з экспанатамі, якія расказваюць пра быт і мастацтва старажытнага народа — этрускаў.

Правядзенне трэцяга працоўнага семестра ў братняй Чэхаславакіі студэнтамі ГДУ яшчэ раз пераконвае ў тым, што такія сустрэчы, сумесная праца збліжаюць нашы краіны, нашы народы, служаць справе ўмацавання міру на зямлі.

**Г. ІЛЬЮШЧАНКА,**
**баец інтэратрада «Дружба-82».**

**НА ЗДЫМКУ:** байцы СБА «Дружба-82» разам з чэшскімі рабочымі.

Фота В. Васюка.

